Рыжкоўская В.В., студ. гр. 313 ФТБК і СМ
БДУКМ
Навуковы кіраўнік – Васюк Т.І.,
дацэнт

# ДРОБНАЯ ПЛАСТЫКА СТАРАЖЫТНАЙ БЕЛАРУСІ

Мастацтва скульптуры малых форм бярэ свой пачатак у глыбокай старажытнасці. Яно захоўвае ў сабе вялікую разнастайнасць накірункаў, матэрыялаў, тэхнік.

Дробная пластыка або скульптура малых форм – гэта від станковай скульптуры, які адрозніваецца невялікімі памерамі.Да дробнай пластыкі адносіцца так сама і медельернае мастацтва. У ім выкарыстоўваюцца самыя разнастайныя матэрыялы: камень, гліна, фарфор, шкло і г. д..

Асаблівасць твораў дробнай пластыкі – ярка выражаны мастацкі вобраз, псіхалагізм і абагульненне. Стрыманасць ў выкарыстанні дэкаратыўных прыемаў аздобы выяў.

Першыя прыкметы ўзнікнення выўленчага мастацтва на Беларусі з'явіліся яшчэ ў эпоху палеаліту, прыкдадна 22 – 25 стагоддзяў таму назад, калі на прымітыўныя прылады пачалі наносіцца элементы арнаментыкі. Многія з дайшоўшых да нас вырабаў паўстаюць у выглядзе ўпрыгожаных арнаментам прадметаў быту, прылад працы і зброі.

Шматлікія помнікі мастацтва VIII – X стст. адлюстроўваюць язычніцкія магічныя ўяўленні ўсходніх славян. У перыяд дахрысціянскіх вераванняў узяла свой пачатак зааморфная і антрапаморфная пластыка. З дапамогай зааморфнай пластыкі абогатваралася жывела: коні, быкі, мядзведзі. Антрапаморфная пластыка гэтага перыяду прадстаўлена выявамі багоў, якія ўвасаблялі стыхійныя з'явы прыроды і часта падаваліся ў выглядзе людзей [2].

Асноўнымі відамі выяўленчага мастацтва язычніцкай культуры была пластыка дробных форм і дэкаратыўна-арнаментальная графіка побытовага



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

характару. Выконваючы ролю пластычных і схематычных знакаў, творы гэтай культуры з’яўляліся як бы пасрэднікамі паміж воляй, жаданнем чалавека і стыхійнымі праявамі прыроды.

У старажытныя часы дробная гліняная пластыка вызначалася глыбокай змястоўнасцю вобраза – тыпа, падкрэсліваючы адзінства чалавечага і прыроды. Яе месца і роля ў жыцці народа залежала ад узроўню развіцця сацыяльна- культурных адносін грамадства. Змест і сэнс гэтых выяў, іх функцыянальныя значэнні былі найперш рытуальна – культавага характару. У асоўным гэта былі фігуркі жывел і птушак, якіх чалавек надзяляў магічным сэнсам. Абагульнена-сімвалічны сэнс гліняных выяў язычніцкай культуры заключаў у сабе поўную залежнасць нашага продка ад сімвалу вобраза. Адсюль магічнасць функцыі самой фігуркі, якая абагатваралася чалавекам, несла ў сабе сплаў фантазіі і жадання. Керамічная пластыка дробных форм прымала ўдзел у рытуальна-культавых дзеяннях жыцця чалавека, выконвала і камунікацыйныя функцыі, як перадачу асноўных норм і ідэалаў [4].

Паступова рэлігійная сутнасць абрадавай культуры язычніцкіх вераванняў змянялася на хрысціянскую. Гэты працэс працякаў не шляхам замен старых форм на новыя, а шляхам наслойвання новых традыцый на папярэднія. Пераасэнсаваўся сам сімвал вобраза, павялічыліся функцыянальныя значэнні. Калі ў эпоху язычніцтва знак вобраза выяў уяўляў погляд на навакольны свет і быў абаронным сродкам, то з прыняццем хрысціянства гліняныя выявы сталі як знакамі рэлігійнага культа, так і знакамі сімвалу тэатралізаванага свята.

**Шахматы.** Пластыка малых форм, якая атрымала дамінуючае развіццё ў раннім сярэднявеччы у асноўным падзяляецца на дзве групы: культавую, якая несла вялікі уплыў візантыйскай культуры, і свецкую.

Асаблівую папулярнасць сярод культавых вырабаў мелі літыя крыжы і абразы, якія тасама адліваліся з металу, або выразаліся з косці або камяню.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Аб'ёмная пластыка прадстаўлена свецкімі вырабамі, з якіх вылучаюцца шахматныя фігуры, якія адчулі трансфармацыю ад усходняга стылю да мясцовай манеры.

Старажытныя разьбярскія традыцыі прасочваюцца на касцяных шахматных фігурках. Першае знаемства з шахматамі ў насельніцтва тэрыторыі Беларусі адбылося не пазней 11ст., аб чым сведчыць фігура каня з паселішча на рэчцы Менцы пад Мінскам. Траплялі шахматы з Персіі і Сярэдняй Азіі, верагодна, праз Хазарскі каганат і Волжскую Булгарыю. Паколькі іслам забараняў адлюстраванне жывых істот, шахматныя фігуры насілі абстрактны характар.

Апрача абстрактных шахматных фігур папулярнымі былі так званыя шахматы “з тварыкамі”, якія выраблялісяў рэалістычнай манеры. Іх выразалі з косці ці каменю. Кожная такая фігура 11-13 стст. – гэта па-майстэрску выкананая мініяцюрная скульптура, у якой адначасова адлюстраваны жывыя назіранні разьбяра і вопыт мастацкай разьбы, набыты славянамі яшчэ ў часы язычніцтва. На Беларусі знойдзена пять фігур “з тварыкамі”, якія датуюцца 12-13 стст. Майстэрства іх выканання і дакладнасць перадачы дэталей сведчаць аб тым, што зроблены яны таленавітымі мясцовымі разьбярамі.[1]

Фігура, відаць ферзя, знойдзеная ў Лукомлі, паказвае чалавека, які сядзіць на невялікай авальнай падстаўцы, склаўшы па-ўсходняму ногі і скрыжаваўшы на грудзях рукі. З-пад галаўнога ўбору (магчыма шлема) звісаюць валасы. Рысы твару некалькі грубаватыя: падбароддзе выступае наперад, нос прыплясканы. Ва ўсей постаци – спакой і ўладарнасць. Адчуваецца характар вобраза, пластыка і абагульненасць формы адпавядаюць канонам старажытнай дробнай пластыкі. Тэхналогія – лепка жгутом, налеп, прадрапванне, чорназадымленая кераміка.

Усе шахматныя фігуры вельмі блізкія паміж сабой па выкананню і апрацоўцы, што сведчыць пра адметнасць стылю ў мініяцюрнай скульптуры

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

старажытнай Беларусі. Шахматныя мініяцюры XII-XIII стст. – важнае пацвярджэнне высокага ўзроўню як матэрыяльнай, так і духоўнай культутры тагачаснага насельніцства Беларусі.

Дробная пластыка рознага гістарычнага часу аб'ядноўваецца і родніцца ўстойлівай традыцыяй вырабу.

Яна выканана пры дапамозе прасцейшых прыемаў лепкі з выкарыстаннем аднолькавай мовы мастацкага выказвання, з улікам даступнасці і кампактнасці ўмоўнай форм:

- лаканізм абагульненай інфармацыі зместа вобраза,
- стылізаваная завершанасць прыроднай формы,
- тпаўтаральнасць тэм і сюжэтаў сцвярджае гэтую думку.

Асноўныя прыемы лепкі:

- лепка жгутом
- выцягванне формы з цэльнага камяка
- лепка з пласта

Спосабы дэкору: прадрапванне, налеп, глазураванне.

Выявы глазураваліся, размалеўваліся ангобам (каляровай глінай), аналінавымі фарбамі, задымліваўся або пакідаўся чысты колер гліны [2].

Сення, ў век тэхнічнага прагрэсу, востра ставіцца пытанне адрадження народнага мастацтва. Мастацтва глінянай цацкі з'яўляецца важным сродкам сувязяў пакаленнў. Цяпер, калі ў нас з'вілася патрэба ў вывучэнні нашай культуры, сама атмасфера жыцця спрыяе развіццю і распаўсюджванню дробнай пластыкі.

Гэта высвятляецца і ў увядзенні ў сістэму адукацыі вучэбных устаноў з мастацкім накірункам розных узроўняў курсаў знаемства з традыцыйным, нацыянальным мастацтвам. Дзеці ўжо пачатковых класаў асвойваюць

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

асноўныя прынцыпы лепкі, знаемяцца з гісторыяй станаўлення дробнай пластыкі і яе адметнымі нацыянальнымі асаблівасцямі. Гэта развівае пачуцце нацыянальнай прыналежнасці, патрыятызм, цікавасць да сваей гісторыі.

Усе часцей і часцей гліняныя цацкі з’яўляюцца не толькі на выстаўках народнай і самадзейнай творчасці, але і прадаюцца на кірмашах. Але ў асноўным іх вырабляюць маладыя , не звязаныя з мясцовымі традыцыямі. Многія творы носяць ілюстрацыйны характар, выяўляюць сухі натуралізм прыродныхх форм. У асноўным яны разлічаны на патрэбы сенняшняга дня.Форма такіх вобразаў выпадковая, адчуваецца, што аўтарам не хапае тых патрэбных ведаў, якія набываюцца гадамі. Творы такога характару не выяўляюць нацыянальную адметнасць.

Сучасным майстрам неабходна вучыцца ў старэйшых думаць вобразна, паэтычна, уносіць у сваю творчасць мастацкія ідэалы, сугучныя нашаму часу.

Спіс выкарыстанай літаратуры:

1. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 т. Т. 1-5; Т. 6. Кн. 1-2. Мн.: БелЭн, 1993-2003.
2. Гісторыя беларускага мастацтва. Т. 1. Мн., Навука і тэхніка,1897
3. Сахута Я. Беларуская народная кераміка. Мн., 1987
4. Ржавуцкі М. Беларуская гліняная цацка. Мн., “Полымя”, 1991

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ